

ПАВЕЛ СУХІ: ШЛЯХ ДА СУСВЕТНАЙ СЛАВЫ.

Сямейная газета

ЯК ПРАВІЛЬНА НАРЫХТАВАЦЬ БЯРОЗАВІК.



Сямейная газета

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

4 КРАСАВІКА 2019 г. ЧАЦВЕР № 63 (28930)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Генадзь БАЛБАТОЎСКІ, дырэктар Рэспубліканскага цэнтра па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні насельніцтва:**

*«Каля 700 тысяч беларусаў у 2019 годзе пройдуць аздараўленне з выкарыстаннем сродкаў рэспубліканскага бюджэту і фонду дзяржаўнага сацыяльнага страхавання. На аздараўленне дзяцей будзе накіравана каля 80 % выдзеленага аб'ёму фінансавання. У летніках рознага тыпу адпачне больш за 390 тысяч дзяцей. Першачарговае права на бясплатныя пуцёўкі дадзена ўдзельнікам Вялікай Айчыннай вайны і асобам, якія да іх прыраўнаныя. Яны могуць штогод адпачываць у санаторыях, інваліды I—II груп — раз у два гады. Акрамя таго, атрымаць санаторна-курортнае лячэнне з частковай аплатай могуць працуючыя грамадзяне. На адпачынак беларусаў запрашаюць і ў здраўніцы, якія знаходзяцца ва ўласнасці Беларусі ў Сочы, Юрмале, Друскінінкаі, Туапсэ, Місхоры».*

# ВЯСНОВЫ КЛОПАТ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Рабочыя «Зялёнгаса» Савецкага раёна Мінска абразаюць дрэвы на вуліцах сталіцы.**

## КОРАТКА

• Указам Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі ўстаноўлены юбілейны медаль «75 гадоў вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў».

• **На сесіі Магілёўскага абласнога Савета дэпутатаў зацверджана на пасадзе старшыні аблвыканкама кандыдатура Леаніда Зайца. Таксама быў прадстаўлены памочнік Прэзідэнта — інспектар па Магілёўскай вобласці Міхаіл Русы.**

• БЧ: білеты з электроннай рэгістрацыяй можна будзе купіць і пасля адпраўлення цягніка.

• **У Беларусі на 1 сакавіка зарэгістравана 21 160 ВІЧ-інфіцыраваных.**

ISSN 1990 - 763X

Спецыяльны рэпартаж

# ВАНДРОЎКА ПА ЭНЕРГЕТЫЧНЫМ АЎТАБАНЕ

### Нулявы электракіламетр, вада для атамнага рэактара і ўранавыя таблеткі

**Адкуль бярэцца ядзернае паліва, як робяць ваду для ахаладжэння энергаблока і навошта Беларускай атамнай электрастанцыі лавушка расплаву. Пра ўсё гэта і шмат што іншае журналісты даведаліся на экскурсіі па АЭС, дзе яны ўгледзелі разрыў трубаправоду на рэактары і ліквідацыю аварыі... у камп'ютарнай версіі. Арыгінальнае падарожжа зладзіла Мінэнерга.**

**1000 кіламетраў пад напружаннем 330 тысяч вольт**

На свае вочы пабачыць, што адбываецца на самай вялізнай будоўлі ў Еўропе, а таксама даведацца пра меры бяспекі на станцыі, першы рэактар якой будзе запушчаны сёлета, — магчымасць, ад якой не адмаўляюцца. Тым больш што трапіць на АЭС без спецыяльнага пропуску неўзабаве будзе ўжо немагчыма.

Вакол АЭС збудавана высакавольтная інфраструктура, якая гатовая прыняць энергію. Працуюць трансфарматары і камплектнае размеркавальнае ўстройства элегазавае (КРУЭ), якое летась у снежні падключылі да напружання ад падстанцыі «Паставы». Пакуль яна адзіная з сямі ўведзена ў строй. Электрычнасць прымаюць звонку для сілкавання ўласных патрэб станцыі. Уласную энергію яна, зразумела, пакуль яшчэ не генерыруе.

СТАР. 4

Размова па сутнасці

# АД МОВЫ ДА НЕСУПЯРЭЧЛІВАЙ ГІСТОРЫІ

### Гаворым аб Канцэпцыі інфармацыйнай бяспекі з адным з яе аўтараў



**Нядаўна Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка падпісаў маштабны дакумент — Канцэпцыю інфармацыйнай бяспекі Рэспублікі Беларусь (друкавалася ў «Звяздзе» 26.03.2018). Над ім працавалі спецыялісты амаль з 20 дзяржаўных органаў і арганізацый — сродкаў масавай інфармацыі, навуковых устаноў, парламента. Адным з распрацоўшчыкаў канцэпцыі стаў старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па адукацыі, культуры і навуцы Ігар МАРЗАЛЮК. Член-карэспандэнт НАН, доктар гістарычных навук, прафесар упэўнены: новая канцэпцыя абараняе канстытуцыйнае права на аб'ектыўную і праўдзівую інфармацыю.**

СТАР. 13